Нарач. Невядомыя старонкі

СТАР. 5

Акругленне правядуць да капейкі

СТАР. 6

700 машын у адной кватэры

СТАР. 16

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

31 САКАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 59 (28169) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Афіцыйна

ПАЗІТЫЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Наша краіна настроена на працяг адкрытага канструктыўнага дыялогу з ЗША

Пра гэта ішла размова на сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і намесніка памочніка міністра абароны ЗША Майкла Карпентэра.

У беларуска-амерыканскіх адносінах пасля працяглага перапынку адзначаюцца пазітыўныя тэндэнцыі. Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што гэта будзе новым этапам узаемадзеяння. Палітызаванасць адносін Беларусі з заходнімі краінамі занадта высокая, і, на думку Прэзідэнта, варта звярнуць больш увагі на развіццё гандлёва-эканамічнага складніка, што стала б добрым падмуркам для супрацоўніцтва па ўсіх астатніх напрамках. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка прапанаваў вызначыць некалькі канкрэтных сфер у эканоміцы, з якіх гэтая праца пачнецца.

На сустрэчы абмяркоўвалася сітуацыя ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў цэлым, і ва Украіне ў прыватнасці, магчымыя шляхі ўрэгулявання канфлікту ў гэтай дзяржаве, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Амерыканскі бок цікавіла меркаванне беларускага лідара па гэтых пытаннях. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што выклікі, якія з'яўляюцца цяпер ва Усходняй Еўропе, здольныя сур'ёзна паўплываць на сітуацыю на ўсім кантыненце. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што неаднаразова прапаноўваў падключыць да ўрэгулявання крызісу ва Украіне Злучаныя Штаты Амерыкі, і час даказаў яго правату. «Калі Злучаныя Штаты захочуць заўтра спыніць вайну на ўсходзе Украіны і зробяць некалькі крокаў у гэтым кірунку, гэтая мясарубка там будзе скончана», — пераканаў Прэзідэнт.

Беларусь цэніць міжнароднае меркаванне аб яе ролі ва ўрэгуляванні ўкраінскага канфлікту. Як запэўніў кіраўнік дзяржавы, беларускі бок заўсёды будзе прыхільнікам прынцыпаў міру, паколькі яму вайна ва Украіне не патрэбна. «З нашай зямлі, з нашай тэрыторыі пагроз Украіне ніколі не было і не будзе. Мы схільныя праводзіць міралюбівую палітыку, зрабіць усё для таго, каб нармалізаваць сітуацыю ва Украіне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Міралюбівая пазіцыя адлюстравана і ў Ваеннай дактрыне Беларусі. «Наша Ваенная дактрына выключна абарончая, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ніколі ні на каго не будзем нападаць, прымяняць зброю супраць якой бы там ні было краіны. Ніколі суседзі на нас пальцам не пакажуць у сувязі з гэтым».

Такой жа пазіцыі Беларусь прытрымліваецца і ў АДКБ, пры гэтым строга выконваючы свае абавязацельствы перад гэтай арганізацыяй і перад Расіяй.

На постсавецкай прасторы выказваецца заклапочанасць з нагоды актывізацыі ў рэгіёне Паўночнаатлантычнага альянсу. Беларусь таксама не ў захапленні ад руху НАТА на Усход. Аднак Аляксандр Лукашэнка не схільны дэманізаваць гэты працэс, а таксама думаць, што НАТА збіраецца ваяваць з Расіяй ці Беларуссю. «У цяперашніх умовах гэта неверагодна і нікому не трэба», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Больш за тое, Прэзідэнт Беларусі выказаў перакананасць, што ні Амерыцы, ні Еўропе не патрэбны яшчэ адзін канфлікт ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне. «Веру ў тое, гэта і дэкларуюць палітыкі ЗША, што Амерыка абсалютна хоча мірнай і незалежнай Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Існуючыя праблемы з заходнімі партнёрамі Беларусь прапануе вырашаць шляхам дыялогу. Гэта датычыцца і двухбаковых стасункаў з ЗША, да якіх у беларускім грамадстве склалася самае добрае і паважлівае стаўленне.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

4 красавіка 2016 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

«НЯХАЙ ЗЯМЕЛЬКА СКАЖА СЛОВА...»

Масавая сяўба пачнецца з наступнага тыдня

Фота БЕЛТА.

Пакуль сеяць пачалі толькі ў некаторых рэгіёнах Брэсцкай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Але, як адзначае намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрый Лужынскі, пры захаванні цяперашняга тэмпературнага рэжыму ўжо з наступнага тыдня сяўба набудзе масавы характар. Пры гэтым Дзмітрый Лужынскі адзначыў, што крыху пазней, чым у астатніх рэгіёнах, яна можа пачацца ў паўночных раёнах Віцебскай вобласці і паўночна-ўсходніх раёнах Магілёўскай вобласці. СТАР. 3

У Бялыніцкім раёне Магілёўшчыны сяўба яшчэ не распачалася, але механізатары, як, напрыклад, Уладзімір КАЗАКОЎ, ужо на поле выехалі. У СВК «Калгас «Радзіма» падсяваюць канюшыну, якая займае ў гаспадарцы плошчу 800 га.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАЎХУТА, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

«Мы прапануем уводзіць раздзельны збор адходаў, вызначыць, што арганічныя харчовыя адходы не павінны трапляць разам з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. Таксама пры будаўніцтве палігонаў неабходна ўлічваць будаўніцтва біягазавых комплексаў. Для гэтага патрэбныя тэхнічныя рашэнні. Гаворка ідзе пра тое, каб дэгазаваць палігоны, створаныя раней, выключыць так званы звалачны газ, які складаецца на 70% з метану і на 30% з вуглякіслага газу. Гэта дасць магчымасць атрымаць эканамічную выгаду ад выкарыстання палігонаў і паменшыць нагрузку на навакольнае асяроддзе».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.03.2016 г.

Долар ЗША	20133,00	▼
Еўра	22779,00	▲
Рас. руб.	297,49	▲
Укр. грыўня	768,44	▲

Лідзія ЯРМОШЫНА:

«ГРАМАДСТВА АДЧУВАЕ ДЭФІЦЫТ МОЦНЫХ ЛІДАРАЎ»

Прыкладна два месяцы застаецца да пачатку кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, але патэнцыяльныя кандыдаты, грамадскія аб'яднанні ўжо пачалі рыхтавацца. У які дзень, хутчэй за ўсё, пройдуць выбары? Што з рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ будзе рэалізавана ўжо падчас гэтай кампаніі? Ці мэтазгодна «ісці ў дэпутаты» адразу пасля ўніверсітэта? На гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнту «Звязды» адказала Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Дату прызначыць указ Прэзідэнта

— Сёлета так атрымалася, што апошняя магчымая дата правядзення выбараў — гэта 11 верасня. Гэты дзень найбольш верагодны для правядзення выбараў, ці ўсё ж такі яны адбудуцца раней?

— Думаю, менавіта 11 верасня — у сілу таго, што ў нас ёсць датэрміновае галасаванне, і яно пачынаецца ў аўторак, за 5 дзён да асноўнага дня выбараў. Калі казаць пра выбары 4 верасня, то выбарчыя ўчасткі, размешчаныя ў школах, трэба будзе адкрываць да першага верасня. Таму правядзенне выбарчага працэсу датэрміновага галасавання і Дзень ведаў, пачатак навучальнага года, будуць элементарна перашкаджаць адно аднаму. СТАР. 2

■ Людзі справы

ТОЙ САМЫ МЛЫН...

Сямейная пара аднавіла помнік культуры і стварыла тут аграсядзібу

У цэнтры вёскі Новы Свержань, што ў Стаўбцоўскім раёне Міншчыны, на пагорку ўзвышаюцца побач два храмы — Успенская царква і Петрапаўлаўскі касцёл. І праваслаўны, і каталіцкі храмы вядуць адлік сваёй гісторыі з XVI стагоддзя. Непадалёку, у нізіне, на беразе невялікай, але вірлівай рачулкі Жацераўка стаіць вадзяны млын XIX стагоддзя. Падчас Вялікай Айчыннай вайны партызаны спрабавалі яго ўзарваць, каб ім не змаглі карыстацца немцы. Ды старыя муры вытрымалі. У той час, як у суседніх хатах павыбівала шыбы. Лёс старога млына прадвызначыла прырода. У 1958 годзе вясновы крыгаход пашкодзіў дапаможныя збудаванні. Спробы аднавіць работу млына выніку не далі.

Так і стаяла сіратліва будыніна больш як паўстагоддзя, разбуралася пад уздзеяннем непагадзі. Відаць, праз колькі гадоў ад яе не засталося б нават падмурка, калі б не сям'я Гальперыных...

Ала Генадзеўна нарадзілася і вырасла ў Новым Свержані, пасля вучобы засталася ў Мінску. На сваю малую радзіму наведвалася спачатку адна, а пасля з мужам і дзецьмі. Яе бацькі прыехалі ў мястэчка на працу, ды і засталіся тут, пабудавалі дом, абжыліся, абзавяліся малымі.

— Тата апошнія 20 гадоў быў дырэктарам школы-інтэрната, што знаходзілася літаральна ў трох кіламетрах ад вёскі. Маці — таксама педагог. На жаль, яны ўжо пайшлі з жыцця, — уздыхае мая суразмоўца. СТАР. 8

Фота Васіля ЗЯНЬКО.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Расія і ЗША абмяркоўваюць сумесныя планы па ўзяцці сталіцы ІД

Расія і ЗША абмяркоўваюць канкрэтныя ваенныя крокі па ўзяцці Ракі — «сталіцы» так званай «Ісламскай дзяржавы». Пра гэта паведаміў намеснік кіраўніка міністэрства замежных спраў РФ Алег Сырамалотаў. «Канкрэтныя аспекты такога ўзаемадзеяння, у тым ліку і з улікам вываду часткі нашага кантынгенту, абмяркоўваюцца паміж нашымі ваеннымі і кіраўніцтвам Пентагона», — сказаў ён. Сырамалотаў адзначыў, што ў Вашынгтона «надыходзіць прасвятленне» і ўлады ЗША ўсведамляюць неабходнасць не толькі абменьвацца інфармацыяй аб ваенных аперацыях, а рэальна каардынаваць дзеянні ў барацьбе з тэрарызмам.

Назарбаеў заклікаў ЕС адмяніць візы для грамадзян Казахстана

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў на сустрэчы з кіраўніком Еўракамісіі Жан-Клодам Юнкерам папрасіў разгледзець пытанне аб бязвізавым наведванні грамадзянамі рэспублікі краін Еўрапейскага саюза. «Я прасіў спадара Юнкера аб тым, каб візавы рэжым, які для еўрапейцаў Казахстан зрабіў свабодным на 15-30 сутак, люстраным быў бы і для нашых грамадзян», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Назарбаеў таксама паведаміў аб просьбе вырашыць праблему палётаў авіякампаній рэспублікі ў Еўропу.

Аўстралія пачне прадаваць Украіне ўран для АЭС

Аўстралія плануе пачаць продаж Украіне ўрану для АЭС. Пра гэта заявіла міністр замежных спраў краіны Джулі Бішап перад адлётам у Вашынгтон на міжнародны саміт па ядзернай бяспецы. Падчас мерапрыемства Бішап мае намер сустрэцца з прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам.

Краіны ААН абвясцілі аб гатоўнасці прадаставіць сірыйцам 178 тыс. працоўных месцаў

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун паведаміў, што дзяржавы — члены арганізацыі гатовыя прапанаваць сірыйцам 178 тыс. працоўных месцаў. Пра гэта ён заявіў на адкрыцці канферэнцыі па аказанні дапамогі сірыйскім бежанцам у Жэневе. Генеральны сакратар ААН таксама заклікаў павялічыць фінансавую падтрымку краін, якія прымаюць бежанцаў з Сірыі.

ISSN 1990 - 763X



Іван ГАРАЛЬЧУК, інжынер Мінскага завода аўтамабільнай камплектацыі:

— У мяне на самой справе часта пытаюцца, чаму я выпісваю менавіта гэту газету? Паспрабую адказаць. Па-першае, таму што я (без пафасу) беларус. А значыць, павінен, як мінімум, паважаць месца свайго нараджэння, месца нараджэння продкаў. Па-другое, маці ды радзіму, іх мову не выбіраюць — яны нам дадзены звыш... Праўда, у маленстве, на сваім заходнім Палессі, я збольшага чуў «трасянку», заснаваную на суседняй украінскай мове, рускай, бо на ёй размаўляла начальства і мізэрна — на польскай. Сапраўдную ж беларускую мы трохі вучылі ў школе, і мне з дзяцінства было цікава, чаму я, жывучы ў Беларусі, амаль не чую мовы тытульнай нацыі?

Чытаючы «Звязду», мне асабіста хацелася сцвердзіцца ў сваім праве быць грамадзянінам Беларусі і носьбітам беларускай мовы.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«...БО ШКЛЯНКА ЎСЁ Ж НАПАЛОВУ ПОЎНАЯ!»

І гэта — скажу вам — атрымалася: бачце — я пішу па-беларуску (нават у любімую рубрыку «Алё, народ на провадзе!»), магу размаўляць. І мяркую, што я такі — не адзін... Хоць і здаецца часам, што... амаль адзін. Але ж ёсць калектыў газеты, ёсць «звяздоўскія» сябры, ёсць мой пляменнік, пісьменнік і паэт Генадзь Мішчук ды многія, многія іншыя. А таму я прытрымліваюся прынцыпу аптымістаў: шклянка хутчэй напалову поўная, чым пустая...

Два дзесяцігоддзі са «Звяздой» падарылі мне адчуванне еднасці з вялікай Радзімай, з Беларуссю. Так што «звяздоўцам» мой шчыры дзякуй!

Што да самой газеты, то ў ёй мне падабаецца ўсё — нават праграма тэлебачання.

Хочацца яшчэ расказаць пра ўдзел у звяздоўскай латарэі, але пра гэта я лепш прамаўчу — каб не суркаваць. Скажу хіба, што тэлевізар ды мотакасілка — гэта не поўны пералік прызоў, якія мне пашчасціла выйграць... На працы ажно зайздросцяць. А я ўсім адказваю: выпісвайце «Звязду», — выйграеце і вы. Прычым выйграеце ў поўным сэнсе гэтага слова.

КАРАТКА

Аляксандр Лукашэнка 30 сакавіка падпісаў указ аб усталяванні дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Княствам Манака.

У Беларусі на сацыяльную, медыцынскую, жыллёвую падтрымку сем'яў і дзяцей плануецца накіраваць у бягучым пяцігоддзі больш як Br12,5 трлн. Гэта прадугледжана падпраграмай «Сям'я і дзяцінства» Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады.

Першы транш крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця (ЕФСР) — $500 млн — пералічаны Беларусі.

Узнагароджанне за знаходку каштоўных скарбаў плануецца выплачваць з Мінскага гарадскога і базавых бюджэтаў.

У Мінску пры спрыяльных умовах надвор'я 15 красавіка пачнуць работу каля 2 тыс. сезонных аб'ектаў дробнарознічнага гандлю: міні-кавярняў, сезонных кавярняў, кіёскаў, павільёнаў, палатак.

■ Парламенцкі дзённік

СТРАТЭГІЧНЫЯ ЗАКОНАПРАЕКТЫ

дэпутаты разгледзяць ужо на пачатку сесіі

Цяпер на разглядзе ў ніжняй палаце знаходзіцца больш як 60 законапраектаў, каля 40 з іх — цалкам гатовыя. На вясновай сесіі будуць разглядацца такія вызначальныя дакументы, як праект праграмы дзейнасці ўрада на 2016—2020 гады, праект закона «Аб зацвярджэнні Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь», праект Кодэкса аб культуры.

— Мы ўжо практычна падыходзім да завяршэння сваёй дзейнасці, — заўважыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падчас пасяджэння. — Разам з тым нам нельга зніжаць набраных тэмпаў, неабходна зрабіць усё, каб дастойна завяршыць сваю працу. Усе пытанні, што знаходзяцца ў Палаце прадстаўнікоў, павінны быць разгледжаны якасна і своечасова.

Па словах спікера ніжняй палаты, галоўнае сёння — устойлівы эканамічны рост, павышэнне дабрабыту народа. У гэтым сэнсе найважнейшым пытаннем сесіі з'яўляецца разгляд праграмы дзейнасці ўрада на 2016 — 2020 гады.

Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, паведаміў, што праграму дзейнасці ўрада ў авальнай зале плануюць абмеркаваць ужо 5 красавіка.

— Эканамічны блок, відаць, галоўны ў праграме, — звярнуў увагу парламентарый. — Скажу, што асноўныя пастулаты яго вельмі перасякаюцца з Указам Прэзідэнта №78. Тая тэма, на якую сёння ідзе асноўная нагрузка — гэта, безумоўна, стварэнне працоўных месцаў, вырашэнне пытанняў, звязаных з перакрыжаваным субсідаваннем...

Стратэгічным дакументам з'яўляецца і праект Ваеннай дактрыны. Як адзначыў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ**, плануецца на гэтай сесіі разглядзець яе ў двух чытаннях. Ён звярнуў увагу, што сёння ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца і праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях барацьбы з тэрарызмам».

Падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў абмяркоўваліся і асноўныя вынікі працы дэпутатаў у міжсесійны перыяд. Тут значнае месца займае міжнародная дзейнасць парламентарыяў. **Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах**, паведаміў, што ўжо на гэтым тыдні да нас прыязджае парламенцкая дэлегацыя Балгарыі, а ў сярэдзіне красавіка нашу краіну наведае дэлегацыя Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора.

— Мы спадзяёмся падпісаць пагадненне аб атрыманні статусу назіральніка ў гэтай арганізацыі, — падзяліўся планамі старшыня Пастаяннай камісіі.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ПРАЕКТ КОДЭКСА АБ КУЛЬТУРЫ ПАДРЫХТАВАНЫ

Другое чытанне дакумента пройдзе ў Палаце прадстаўнікоў падчас вясновай сесіі ў пачатку красавіка

Праект Кодэкса аб культуры Беларусі ўжо прыняты дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні ў снежні 2015 года. Неабходнасць падрыхтоўкі кодэкса абумоўлена патрэбай у комплексным і сістэмным рэгуляванні грамадскіх адносін у сферы культуры.

Цягам трох месяцаў над праектам кодэкса ішла актыўная праца ў рабочай групе, якая створана пры Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы. У склад рабочай групы ўвайшлі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, спецыялісты і адказныя супрацоўнікі Міністэрства культуры, сакратарыяту Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў краіны. Вывучаліся, аналізаваліся прапановы і заўвагі, якія паступілі ад зацікаўленых.

— Мы суадносім практыку і заканатворчасць, выслухоўваем заўвагі грамадзян, службовых асоб, аналізуем, як пэўная норма кодэкса адаб'ецца ў жыцці. І пытанні з жыцця, якія дэпутаты прывозяць са сваіх выбарчых акруг, — важная крыніца рэдакцыйных і змястоўных удакладненняў праекта Кодэкса аб культуры, — падкрэсліла **Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы.** — Таксама мы вывучылі прапановы і меркаванні міністэрстваў гандлю і фінансаў, прадстаўнікоў творчых саюзаў, Таварыства беларускай мовы, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Інстытута гісторыі НАН, канфедэрацыі творчых саюзаў.

Дакумент канцэптуальна не змяніўся, але ў ім улічаны шматлікія прапановы, зроблена каля двух з паловай дзясяткаў змен і дапаўненняў. Так, змяніўся змест асобных палажэнняў раздзела аб ахове археалагічнай спадчыны: ёсць змены ў падыходзе да ўліку археалагічных аб'ектаў і артэфактаў. Праектам кодэкса прапануецца стварэнне рэестра археалагічных артэфактаў, якія знаходзяцца ва ўладанні грамадзян і юрыдычных асоб, таксама будзе весціся ўлік аб'ектаў і артэфактаў, што на момант выяўлення не маюць уласніка.

Дапоўнены артыкулы аб супрацоўніцтве дзяржаўных устаноў і камерцыйных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў. Дапоўніліся палажэнні аб грамадскім кантролі ў сферы культуры: прадугледжваецца права членаў грамадскіх назіральных камісій па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўносіць уласніку матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці прапановы аб ліквідацыі парушэнняў ахоўных абавязкаў. Ёсць змены і ў палажэнні аб выплаце ўзнагароджаняў за выпадкова выяўленую каштоўнасць ці скарб: удакладнілі, што яны будуць ажыццяўляцца за кошт бюджэту базавага ўзроўню і Мінска. Змяніўся і падыход да пацвярджэння статусу творчага работніка для асоб, якія не з'яўляюцца сябрамі творчых саюзаў. Пацвярджэнне будзе ажыццяўляцца членамі экспертнай камісіі, створанай пры Міністэрстве культуры.

Ёсць дапаўненні, якія рэгулююць правы і абавязкі арганізатараў культурна-масавых мерапрыемстваў. У адпаведнасці з праектам кодэкса арганізатар павінен забяспечыць аказанне грамадзянам медыцынскай дапамогі, паведаміць зацікаўленым асобам аб зменах у складзе ўдзельнікаў мерапрыемства. Тэрмін выплаты кампенсацыі ўваходных білетаў на культурна-масавае мерапрыемства вызначаны ў памеры сямі каляндарных дзён з моманту падачы заявы. Удакладніўся пералік асоб, якія могуць хадайнічаць аб наданні статусу народнага майстра. Удакладніліся вызначэнні фільмаў у ігравой, неігравой, анімацыйнай формах, удакладнена азначэнне фільма, які мае важнае сацыяльна-культурнае значэнне.

Кодэкс аб культуры будзе рэгуляваць і працу музейных устаноў краіны.

— Устаноўлены крытэрыі і абавязковыя ўмовы для стварэння музея, сярод іх — магчымасць увядзення штатных адзінак музейных супрацоўнікаў. Гэта яшчэ адзін крытэрый, у адпаведнасці з якім кодэкс размяжуе паняцці музеяў, музейных пакояў, асобных тэматычных экспазіцый, — зазначае **начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Алена ВЕШТАРТ.**

У адпаведнасці з праектам кодэкса для перадачы музейных прадметаў, якія ўключаны ў Музейны фонд Беларусі і з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, ад аднаго да іншага музея на тэрыторыі Беларусі на часовае захоўванне не патрабуецца ўзгадненне з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Кодэкс аб культуры — гэта першы ў Беларусі і на постсавецкай прасторы комплексны дакумент у галіне культуры. Ён цэласны, сістэмны, інавацыйны, суадносіцца з нормамі існуючага заканадаўства. У кодэкс увайшло сем законаў, якія сёння дзейнічаюць у галіне культуры, уключаны нормы пяці ўказаў Прэзідэнта, пастановы Савета Міністраў, Міністэрства культуры, што рэгулююць агульныя пытанні культуры.

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

«ГРАМАДСТВА АДЧУВАЕ ДЭФІЦЫТ МОЦНЫХ ЛІДАРАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Лічу, што нам сапраўды неабходна адзначыць Дзень ведаў, Дзень беларускага пісьменства (4 верасня.— **Аўт.**), а потым ужо прыступіць да самога выбарчага працэсу. Я буду прапаноўваць кіраўніку дзяржавы, калі мы будзем прадстаўляць яму праект указа аб назначэнні выбараў, дату 11 верасня.

— Калі прыкладна гэты праект указа будзе прадстаўлены?

— Калі мы гаворым пра выбары 11 верасня, то ўказ павінен з'явіцца да 11 чэрвеня. Мы будзем прасіць, каб ён з'явіўся раней — магчыма, 6-7 чэрвеня. Каб у нашых палітычных сіл — партый, грамадскіх аб'яднанняў — было ў запасе некалькі дзён для вылучэння кандыдатаў у выбарчыя камісіі. Даводзіць да крайняга тэрміну было б негуманна ў дачыненні да тых, хто ўдзельнічае ў выбарчым працэсе.

Назіральнікам будзе прасцей працаваць

— Якія рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ могуць быць рэалізаваны ўжо на наступных выбарах — я маю на ўвазе парады, што не патрабуюць змен у заканадаўстве?

— Думаю, самае галоўнае з'яўляецца і самым складаным — гэта ўпарадкаванне працэдуры падліку галасоў і размяшчэнне назіральнікаў на тэрыторыі выбарчых участкаў. Намі будуць дадзены адпаведныя рэкамендацыі, якія палепшаць становішча назіральнікаў падчас працэсу падліку галасоў.

— Якія змены ў будучыні чакаюць Выбарчы кодэкс?

— Мне складана сказаць, бо гэта патрабуе ўсеагульнага ўхвалення — як правіла, працэс унясення змен у выбарчае заканадаўства, іх узгадненне праходзіць дастаткова складана і нервова. У гэтым удзельнічаюць, па сутнасці, усе суб'екты заканадаўчай ініцыятывы — гэта кіраўнік дзяржавы, Нацыянальны сход, урад. Ва ўсіх ёсць свой погляд. Таму мне складана сказаць, што з тых прапаноў, якія будзе ўносіць Цэнтральная камісія ў адпаведнасці з рэкамендацыямі АБСЕ, застанецца падчас гэтых абмеркаванняў.

Адназначна магу сказаць, што, мне здаецца, застануцца нормы, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў пры правядзенні перадвыбарнай агітацыі. А менавіта: стварэнне больш свабодных умоў для арганізацыі перадвыбарных сходаў і сустрэч і распаўсюджанне льготнага парадку арганізацыі мітынгаў не толькі на кандыдатаў, напрыклад, у дэпутаты або ў прэзідэнты, але і на ўсіх грамадзян — калі яны праводзяць гэта мерапрыемства ў рамках выбарчай кампаніі.

— Перад мінулымі выбарамі ў мясцовыя Саветы ўжо ўносіліся змены ў выбарчае заканадаўства. Яны таксама складана праходзілі?

— Так. Цэнтральная камісія не валодае правамі суб'екта заканадаўчай ініцыятывы. Аднак паколькі мы назапашваем тут усю правапрымяняльную практыку, то, натуральна, з'яўляемся ў гэтай галіне экспертам. Калі мы бачым, што нейкая норма не спрацоўвае або працуе не так, як бы хацелася, то рыхтуем у адрас кіраўніка дзяржавы зварот з просьбай разгледзець магчымасць унясення змен. Такі працэс адбываўся ў 2013 годзе, напярэдадні мясцовых выбараў.

У кіраўніка дзяржавы была арганізавана нарада, дзе ў цэлым былі ўхвалены або адхілены тыя ці іншыя прапановы Цэнтральнай камісіі. Потым, калі ўсё было падрыхтавана і ўзгоднена, праходзіла наступная нарада, падчас якой была выпрацавана канчатковае рашэнне па ўсіх папраўках. Толькі тады кіраўнік дзяржавы ўнёс гэтыя прапановы ў парламент.

Змены ў выбарчае заканадаўства з'яўляюцца, відаць, найбольш у працэдурным плане працаёмкімі. Таму што, па-першае, яны простыя: кожны чалавек, які ўдзельнічае ў выбарах, у стане іх ацаніць. Па-другое, усе, хто мае дачыненне да выбараў, — а гэта абсалютна ўсе дзяржаўныя органы — заўсёды маюць сваю выразную пазіцыю. Часта гэтыя пазіцыі не супадаюць. Выбарчы закон — заўсёды плод кампрамісу.

— Колькі прыкладна часу патрэбна для такіх змен?

— Сама па сабе працэдура ўнясення змен не з'яўляецца чыста парламенцкай. Два чытанні ў адной палаце, два — у другой. Але самым доўгім перыядам з'яўляецца дапарламенцкі, калі прапановы афармляюцца ў выглядзе нормаў закона. Потым ідзе доўгая працэдура ўзгадненняў і абмеркаванняў.

Справа дарослых людзей

— Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа стаць грамадзянін, які дасягнуў 21 года. Як вы ставіцеся да маладых кандыдатаў у дэпутаты?

— Шчыра кажучы, я лічу, што да таго, як стаць кандыдатам, яны ўсё-такі павінны нечаму навучыцца як прафесіяналы — у адпаведнасці з выбраным напрамкам. Ёсць верагоднасць, што калі яны пакінуць сцены парламента — а ім гэта прыйдзецца зрабіць, як і ўсім, бо адбываецца ратацыя, — яны страцяць асноўную сваю спецыяльнасць і стануць няшчаснымі людзьмі. Думаю, што ўсё-такі людзям спачатку трэба адбыцца ў прафесіі, а потым ісці ў палітыку. Палітыка — гэта справа, перш за ўсё, сталых людзей.

— Сыходзячы з вопыту сваёй працы ў Цэнтральнай камісіі, што вы можаце сказаць пра такіх маладых людзей, якія ўсё ж праявілі сябе на гэтай ніве?

— У нас з дэпутатаў і міністры атрымліваюцца. Ну ці намеснікі міністраў. Але гэта хутчэй рэдкасць. Думаю, што кар'ерны рост для кожнага ўсё-такі ляжыць у яго прафесіі. Дэпутацтва ў гэтым плане — вынік тых прафесійных намаганняў, якія зрабіў чалавек у сваім жыцці.

— У Палаце прадстаўнікоў дастаткова шмат жанчын — каля траціны. Як вы ставіцеся да таго, што прыгожы пол ідзе ў палітыку?

— Думаю, гэта можна ацэньваць толькі станоўча, і такое пытанне ўвогуле не павінна ставіцца. У нас жа больш за палову выбаршчыкаў — жанчыны. І таму адна траціна іх у парламенце — гэта, можа, і малавата. Гэта непрапарцыянальнае прадстаўніцтва. Лічу, што жанчын павінна быць не менш за 50% — тады гэта будзе прапарцыянальна.

Увогуле я не ацэньваю годнасць палітыка з пункту гледжання прынежнасці да таго ці іншага полу. Усё ж больш важныя чалавечыя і прафесійныя якасці, хоць трэба ўсяляк садзейнічаць таму, каб мы трымалі адпаведную планку, не змяншалі яе, а павялічвалі — маю на ўвазе гендарнае прадстаўніцтва ў органах улады.

Ахвотнікаў балатавацца ў парламент дастаткова

— Мінулыя парламенцкія выбары ў Палату прадстаўнікоў вы называлі самымі простымі на сваёй памяці. Як думаеце, што было таму прычынай?

— Відаць, я мела на ўвазе, што яны былі неканфліктнымі. Справа ў тым, што парламенцкія выбары 2000 года былі вельмі канфліктнымі, выбары 2004-га — ускладнены тым, што адначасова праходзіў канстытуцыйны рэферэндум, і гэта таксама накладвала адбітак. Складана ўспомніць асаблівасці выбараў 2008 года...

«Выбарчы закон — заўсёды плод кампрамісу».

Магу сказаць, што недастатковая колькасць кандыдатаў, адсутнасць альтэрнатыў у многіх выбарчых акругах, з аднаго боку, вельмі спрашчае жыццё выбарчым камісіям — робіць яго сапраўды простым. З другога боку, адсутнасць альтэрнатывы робіць працэс нецікавым для выбаршчыкаў.

— Леташняя кампанія па выбарах Прэзідэнта была таксама дастаткова спакойнай. Але і час цяпер няпросты, Прэзідэнту прыходзіцца вырашаць вельмі складаныя задачы. Адпаведна, многія палітыкі ацанілі свае здольнасці і вырашылі пачакаць... Ці ёсць падставы разлічваць, што тыя, хто не рызыкнуў балатавацца на вышэйшую дзяржаўную пасаду, будуць актыўна ўдзельнічаць у кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў?

— Думаю, ёсць усе падставы думаць, што так яно і будзе.

Справа ў тым, што сучаснае грамадства — не толькі наша, а ўвогуле — адчувае дэфіцыт моцных лідараў, людзей, якія здольны павесці за сабой нацыю, што называецца, «да перамогі і росквіту». Таму колькасць кандыдатаў у прэзідэнты, думаю, змяншаецца ў нас, у Расійскай Федэрацыі, у іншых краінах. Гэта вельмі складаная праца, асабліва ў сучасных умовах.

Пры гэтым колькасць палітыкаў не змяншаецца. Атрымліваецца, з аднаго боку — адсутнасць па-сапраўднаму моцных лідараў, з другога — наяўнасць дастатковай колькасці тых людзей, якія гатовы «ў калектыве» вырашаць лёс грамадства. Таму, думаю, колькасць канкурэнтаў для праходжання ў орган такога «калектыўнага розуму», якім з'яўляецца парламент, будзе не змяншацца, а павялічвацца.

— Ужо стала традыцыяй, што падчас выбарчай кампаніі ў нас праводзяцца рознага кшталту сацыялагічныя апытанні. Наколькі эфектыўная і неабходная гэта праца?

— Калі апытанні праведзены карэктна, то, лічу, што гэта вельмі карысна і дазваляе прыблізна прадбачыць вынікі выбараў. Дзяржава ведае, на што можа разлічваць. Іншая справа, што нядобрасумленныя апытанні могуць стаць вельмі моцнай ідэалагічнай зброяй, накіраванай на дэстабілізацыю сітуацыі ў грамадстве: можна ж распаўсюдзіць усё што заўгодна. Таму, думаю, з аднаго боку, гэты інструмент добры, бо дазваляе выявіць грамадскую думку. З другога, карыстацца ім трэба вельмі асцярожна.

— Тры месяцы гэтага года можна лічыць даволі насычанымі, калі казаць пра падзеі, што абмяркоўваюцца ў грамадстве: гэта і павышэнне пенсійнага ўзросту, і зняцце санкцый, і праблемы з аплатай ЖКГ — людзям ёсць пра што пагаварыць. Як гэта паўплывае на рыторыку кандыдатаў у дэпутаты? Ці будзе яна нечым адрознівацца ад мінулых парламенцкіх выбараў?

— Тут маюць значэнне не мінулыя падзеі (хоць, натуральна, і гэта ўплывае), а, перш за ўсё, тая палітычная арыентацыя, якой валодаюць кандыдаты. Калі гэта будуць кандыдаты, што падтрымліваюць мясцовыя афіцыйныя органы, то ў іх будзе адна рыторыка выступленняў. Кандыдаты ад апазіцыі традыцыйна выкарыстоўваюць абсалютна іншую. Думаю, што цяпер апошнія будуць выкарыстоўваць эканамічныя цяжкасці, у тым ліку непапулярныя рашэнні, накіраваныя на павышэнне пенсійнага ўзросту.

— Якая, на вашу думку, роля дэпутата ў XXI стагоддзі?

— Калі дэпутат сапраўды працуе ў акрузе, то самая галоўная яго роля ў тым, што ён з'яўляецца голасам народа пры прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў. Прымаючы закон, дэпутат павінен, перш за ўсё, улічваць меркаванне выбаршчыкаў, якія галасавалі за яго. Калі дэпутат сустракаецца з людзьмі, то ён дастаткова дакладна знаёмы з грамадскай думкай, якая існуе ў гэтай выбарчай акрузе.

Калі будзе гатова грамадства...

— Нядаўна прайшлі датэрміновыя парламенцкія выбары ў Казахстане. Там яны, як вядома, праходзяць па партыйных спісах. Наколькі добрая такая сістэма?

— Яна добрая тым, што выбаршчыкі прынамсі бачаць усё лепшае, што ёсць у палітычнай эліце. Чаму? Таму што кіраўнікі партый — гэта ўсё-такі публічныя палітыкі, якія і выглядаюць годна, і могуць годна прадставіць сваю палітычную пазіцыю ад імя партыі. Калі выбаршчыкі сутыкаюцца з мажарытарнай сістэмай, якая існуе ў нас, то, на жаль, яны часта бачаць людзей, якія зусім не адносяцца да эліты і не з'яўляюцца найлепшымі прадстаўнікамі беларускага грамадства. Тым не менш гэтыя людзі ўдзельнічаюць у выбарах.

Гэта вельмі дэмакратычна, бо выбаршчыкі бачаць кожнага кандыдата. Але, на маю думку, такі непатрабавальны адбор кандыдатаў вядзе да таго, што ў электарату губляецца павага да выбараў і да тых, хто ідзе на выбары ў якасці кандыдата. Чаму? Таму што многія з тых, хто ўдзельнічае ў выбарах, у прынцыпе не маюць для гэтага ні маральных, ні інтэлектуальных падстаў.

— Якія ўмовы патрэбныя, каб выбары і ў нас праводзіліся па партыйных спісах?

— Для гэтага ў нас павінна саспець грамадства. Магчыма, да гэтага павінна падштурхнуць эліта. Да таго ж на гэты момант у нас Канстытуцыя не прадугледжвае магчымасці змянення выбарчай сістэмы ад мажарытарнай да прапарцыянальнай.

Ад традыцыйных спісаў да электроннага рэгістра

— Пра формы галасавання. Сёння, як вядома, многія людзі не жывуць па месцы рэгістрацыі. У той жа час развіццё электронных і мабільных тэхналогій у перспектыве можа даць магчымасць галасаваць на адлегласці. Як вы ставіцеся да гэтага? Наколькі такі спосаб прымальны да нашых рэалій?

— Гэта прымальна, але я з'яўляюся прыхільнікам іншага. Лічу, што развіццё інфармацыйных тэхналогій прывядзе да таго, што мы прыйдзем ад традыцыйных спісаў выбаршчыкаў да адзінага электроннага рэгістра выбаршчыкаў, які будзе даступны ўсім і які можна выкарыстоўваць літаральна на любым выбарчым участку. Электронны рэгістр выбаршчыкаў дасць магчымасць грамадзянам галасаваць на любым участку для галасавання, што знаходзіцца паблізу. Пры гэтым ён дазволіць тут жа перадаваць інфармацыю аб тых, хто прагаласаваў, па іх пастаянным месцы жыхарства — каб у нас не было двайнога галасавання. Таму, думаю, што менавіта гэта з'яўляецца той самай перспектывай, якая дазволіць грамадзянам галасаваць мабільна. Пры гэтым грамадзяне ўсё ж будуць павінны прыйсці на выбарчы ўчастак, прад'явіць дакумент і прагаласаваць.

Чаму я менавіта за гэту форму? Таму што лічу, што галасаванне «на даму» парушыць дэмакратычныя традыцыі ўдзелу ў выбарах. Мы павінны берагчы свае працэдуры... Думаю, дыстанцыйнае галасаванне — праз інтэрнэт — магчыма і патрэбна прымяняць толькі для грамадзян, якія, напрыклад, знаходзяцца за мяжой і для іх праблематычна наведаць выбарчы ўчастак у пасольстве. Або ў нас — калі чалавек, напрыклад, знаходзіцца ў бальніцы (магчыма, нам трэба адмовіцца ад бальнічных участкаў). Але для пераважнай большасці грамадзян, на маю думку, такая форма не павінна прымяняцца. У нас павінны быць і дэмакратычныя традыцыі, і папяровыя бюлетэні, і выбарчыя камісіі, і віншаванні маладых выбаршчыкаў — увесь неабходны набор.

— Многія назіральнікі не маглі не адзначыць нашу высокую яўку на выбарах. Дзякуючы чаму мы дабіліся гэтага?

— Думаю, дзякуючы ідэалагічнай рабоце па месцы працы і вучобы. Што там казаць: у нас над яўкай выбаршчыкаў працуе ўся сістэма дзяржаўных органаў, навучальных устаноў. У пэўныя моманты ёсць элементы пераканання — настолькі настойлівыя, што ў нас часам грамадзяне кажуць, што іх прымушаюць. Насамрэч, гэта выхаванне выбаршчыкаў. Гэта прапанова для іх, каб яны ўсё-такі ўдзельнічалі ў грамадскім, палітычным, дзяржаўным жыцці нашай краіны. Думаю, што гэта найперш заслуга дзяржавы ў асобе яе дзяржаўных структур.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Дом з будучыні

ШМАТПАВЯРХОВІК БЕЗ ЦЭНТРАЛЬНАГА АЦЯПЛЕННЯ?

Сёлета ў Беларусі будуць пабудаваны першыя тры энергаэфектыўныя дамы ў прынцыпова новым эксперыментальным фармаце

Такім чынам, будаўнічай галіной плануецца рэалізаваць сумесны праект з ПРААН, па якім запланавана ўзвядзенне па адным энергаэфектыўным жылым доме ў Мінску, Магілёве і Гродне, паведаміў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ.



Цяпер названы праект выконваецца строга па графіку, калі на практыцы пачалося будаўніцтва ўсіх трох дамоў. Лідарам тут з'яўляецца Магілёў, дзе ўжо манціруюцца першыя паверхі.

Паводле слоў намесніка міністра, эксперты ПРААН выбралі для супрацоўніцтва беларускія заводы буйнапанэльнага домабудавання (БПД). Пры будаўніцтве гэтых дамоў прымяняюцца вельмі прагрэсіўныя тэхнічныя рашэнні, якія дазваляюць атрымаць фармат практычна пасіўнага дома, які амаль не патрабуе ацяплення. Там прадугледжваецца прымяненне сонечных батарэй, паўторнага выкарыстання цяпла (рэкуперацыя) вентыляванага паветра ўнутры памяшкання. «Акрамя таго, у гэтым праекце будзе ўжывацца тэхналогія па зняцці цяпла з той вады, якую жыхары выкарыстоўваюць прымаючы душ або пры мыцці посуду. Робіцца спецыяльная каналізацыйная сістэма, з якой потым гэта цяпло вяртаецца ў дом і выкарыстоўваецца для абагрэву. Прадугледжана таксама атрыманне цяпла з нетраў зямлі», — удакладняе намеснік міністра.

«Так, гэта для нашай будаўнічай галіны новая справа і пілотны праект. Пасля яго завяршэння — паводле вынікаў гэтага года, спецыялісты будуць прымаць рашэнне аб тым, ці трэба яго ўкараняць па ўсёй краіне», — удакладніў пазіцыю міністэрства Дзмітрый Семянкевіч.

А яшчэ суразмоўца паведаміў, што экспертыза генеральнага плана Мінска завершана, праведзена ўзгадненне ў ведамствах і грамадскае абмеркаванне. Зараз генплан знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў. На апошнім этапе пасля гэтага генеральны план сталіцы будзе перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

Намеснік міністра адзначыў, што ў новым генеральным плане Мінска на бліжэйшыя некалькі дзесяцігоддзяў прадугледжана будаўніцтва каля 11 млн квадратных метраў жылля. Там вызначаны перспектыўныя рэзервовыя плошчы для будаўніцтва, сярод якіх разглядаюцца раёны вуліцы Карвата, Зялёны Бор, Масюкоўшчына, Лошыца і жылы комплекс «Нотынгем». Акрамя таго, сярод прыярытэтных задач генплана — скарачэнне да 2019 года штогадовых аб'ёмаў будаўніцтва жылля да 600 тысяч «квадратаў» і будаўніцтва жылля за кошт развіцця гарадоў-спадарожнікаў для 100-120 тысяч жыхароў сталіцы.

Генпланам таксама прадугледжваецца эфектыўнае выкарыстанне вытворчых плошчаў прадпрыемстваў, іх мадэрнізацыя, трансфармацыя, развіццё і стварэнне новых пляцовак, галоўным чынам у заходнім сектары Мінска, паколькі тут сканцэнтраваны асноўныя працоўныя рэсурсы. Прадугледжваецца рэканструкцыя малапавярховай сядзібнай забудовы з вялікім фізічным зносам, а таксама развіццё транспартнай інфраструктуры горада.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Добрая навіна

МЫ СТАЛІ МЕНШ КУРЫЦЬ

Летась на ўнутраным рынку было прададзена 23,5 мільярда штук цыгарэт. Гэта на пяць мільярдаў менш, чым у 2011 годзе.

У Мінгандлю адзначаюць, што змяншаюцца аб'ёмы продажаў алкагольнай прадукцыі. Заканадаўствам краіны забаронена ў поўнай меры рэклама тытунёвых вырабаў, вызначаны месцы, дзе не дазваляецца рэклама алкагольных напояў, абазначаны абмежаванні зместу рэкламы. Разглядаецца пытанне аб распаўсюджванні ўсіх забаронаў, уведзеных на тытунёвыя вырабы, на электронныя цыгарэты. Аб гэтым паведаміла начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Ірына Барышнікава.

Таксама яна адзначыла, што ў нашай краіне добра выконваецца заканадаўчая норма, звязаная з забаронай адкрытай выкладкі тытунёвых вырабаў, што паказаў маніторынг, які правяла грамадская арганізацыя «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў». Так, з ліпеня 2015 года табачныя вырабы і іх узоры нельга размяшчаць у вітрынах магазінаў ці на іншым гандлёвым абсталяванні, інфармацыя павінна даводзіцца пакупніку ў выглядзе пераліку ў месцах продажу. З 252 магазінаў, у якіх правяралася, як выконваецца правіла закрытай выкладкі табачных вырабаў, парушэнні ўстаноўлены толькі ў пяці. Прычым невыкананне было абумоўлена чалавечым фактарам, магазіны мелі неабходнае абсталяванне.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

■ Навука і жыццё

ВЫТВОРЧАСЦЬ З «МАЗГАМІ», ці Беларускі след на Марсе

Беларускія вучоныя падвялі вынікі працы за апошнія пяць гадоў у плане ўкаранення навуковых распрацовак. Пра некаторыя дасягненні Беларусі ў стварэнні ўнікальных інавацый расказалі кіраўнікі вядучых інстытутаў і цэнтраў Нацыянальнай акадэміі навук.

Зусім нядаўна ўвесь навуковы (і не толькі) свет абмяркоўваў старт чарговай марсіянскай місіі ExoMars — на чырвоную планету з касмадрома Байканур адправіўся шэраг даследчых модуляў, якія будуць займацца вывучэннем газавага саставу атмасферы. Акрамя арбітальнага модуля, на Марс паляцеў і дэсантны, пад назвай «Скіяпарэлі», — прыкладна праз сем месяцаў гэты апарат будзе прызямляцца на планету для шэрагу даследаванняў. Цеплаахоўныя матэрыялы, з якіх зроблена абліцоўка дэсантнага модуля, тэсціраваліся ў Інстытуце цепла- і масаабмену НАН.

Яшчэ адзін без перабольшвання знакавы для ўсяго чалавецтва праект, пра які апошнім часам шмат гавораць, — гіпергукавая авіяцыя. Мяркуецца, што пры выкарыстанні найноўшых тэхналогій самалёты змогуць развіваць хуткасць, якая ў 6-7 разоў вышэйшая за хуткасць гуку. Гэта дазволіць апарату даляцець, напрыклад, з Мінска да ЗША прыкладна за 40 хвілін. Аднак праматочны рухавік, які плануецца выкарыстоўваць для такой авіяцыі, патрабуе правільнага згарання паліва. Менавіта даследаваннямі працэсаў гарэння ў такіх рухавіках займаецца ўсё той жа Інстытут цепла- і масаабмену.

— У нас распрацавана тэхналогія высокадакладнай рэалагічнай паліроўкі, — расказаў **дырэктар установы Алег ПЕНЯЗЬКОЎ**. — Яна дазваляе выконваць звышдакладную апрацоўку аб'ектаў дыяметрам да 2,5 метра. Шурпатасць паверхні пасля працэдуры не перавышае 0,1 нанаметра. Тэхналогію мы прадаём як айчынным, так і замежным прадпрыемствам. Яе актыўна выкарыстоўваюць, напрыклад, у аэракасмічнай праграме Кітая, бо іх апараты аснашчаюцца высакаякаснай оптыкай. Таксама ўдзельнічаем у стварэнні другой у свеце лазернай установкі для тэрмаядзернага сінтэзу, якую распрацоўваюць у горадзе Сароў Расійскай Федэрацыі. Гэтая ўстаноўка будзе разаграваць матэрыял да вельмі высокіх тэмператур, а оптыку для лазераў пастаўляе наш інстытут.

Не менш актуальныя распрацоўкі робяцца і ўласна ў Беларусі. Айчынная праграма стварэння беспілотных авіяцыйных комплексаў за 5 гадоў ператварылася ў адзін з самых важных і знакавых беларускіх навуковых праектаў. За гэты час было створана адразу тры брэнды беспілотнікаў: «Бусел» (з далёкасцю палёту 25-50 кіламетраў і працягласцю больш за дзве гадзіны), «Дырыжабль» (комплекс экалагічнага прызначэння для запаведнікаў, а таксама для патрулявання дзяржаўнай мяжы) і «Буравеснік» (створаны на заказ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, далёкасць яго палёту дасягае 290 кіламетраў).

Як распавёў **намеснік дырэктара Навукова-вытворчага цэнтра шматфункцыянальных беспілотных комплексаў НАН Беларусі Аляксандр ШЧАЎЛЕЎ,** падчас працы над апаратамі нашы навукоўцы стварылі шэраг уласных унікальных распрацовак: сістэмы аўтапілота, пасадкі, выратавання, оптыка-электрычнае абсталяванне, якое дазваляе атрымліваць высакаякасныя здымкі зямной паверхні, і іншае. Па словах эксперта, праграма ўжо пачала акупляцца: прадукцыі створана больш, чым укладзена грошай. Прыбытковасць складае каля 18%.

— Мы лічым, што адной з самых запатрабаваных прафесій у свеце ў найбліжэйшы час будзе аператар кіравання беспілотным лятальным комплексам, бо менавіта за гэтым кірункам многія бачаць будучыню авіяцыі, — падкрэслівае навуковец. — Мы хочам увайсці ў 10-15 найлепшых краін па вытворчасці такіх комплексаў, думаю, што гэта выканальная задача.

Пра найбліжэйшыя планы Акадэміі навук у сферы рэалізацыі навуковых напрацовак у тэхналагічных працэсах паведаміў **кіраўнік апарату НАН Пётр ВІЦЯЗЬ**. Па яго словах, адным з такіх праектаў стане новы беларускі спадарожнік з дзялільнай здольнасцю 0,5 метра (першы айчынны касмічны апарат мае дзялільную здольнасць 2 метры) для атрымання больш якасных здымкаў. У перспектыве нашы спадарожнікі і беспілотныя лятальныя апараты будуць аб'яднаны ў цэласную сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.

Акадэмік не абышоў увагай і пэўныя праблемы ў сферы. Так, на яго думку, прадукцыя беларускага машынабудавання не заўсёды застаецца канкурэнтаздольнай. «На жаль, звычайна мы вырабляем тое, што ўмеем, а не тое, што патрабуе рынак», — адзначыў Пётр Віцязь. У прыклад навуковец прывёў трактары: найбольшым попытам карыстаюцца высокамагутныя машыны, мы ж працягваем развіваць старыя кірункі. Тое самае датычыць і кар'ерных самазвалаў: найбольш запатрабаваны «БелАЗы» грузападʼёмнасцю большай за 400 тон — у лінейцы жодзінскага завода толькі адна такая мадэль. Акадэмік лічыць, што вырашыць праблему дапаможа распрацоўка новых навукаёмістых кампанентаў для айчыннай тэхнікі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

НОВЫ ДУХОЎНЫ ЦЭНТР

Адпаведны будынак мусіць з'явіцца ў Мінску

Учора адбыўся малебен на месцы будучых духоўна-адміністрацыйнага комплексу Беларускай Праваслаўнай Царквы і храма ў гонар Уваскрасення славутага, на ўзвядзенне якога даў згоду Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Гэта побач з сённяшнім памяшканнем епархіі, недалёка ад вуліцы Няміга. Набажэнства справіў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. «Гэта будзе цэнтр нашай Царквы», — так ахарактарызаваў уладыка пачатак будаўніцтва.

Пакуль на гэтым месцы расчышчаная пустка. Па словах мітрапаліта, чакаць хуткага пачатка будаўніцтва не варта. Сёння ёсць толькі папярэдні праект будучага цэнтра, а канчатковы яшчэ дапрацоўваецца.

— Раней тут стаяў храм у гонар Уваскрасення славутага. Але ён быў разабраны з-за лядашчасці яшчэ да рэвалюцыі, у XIX стагоддзі, — расказвае іерарх. — Цяпер мы спадзяёмся збудаваць храм з такой жа назвай. Тут мы плануем размясціць вялікую залу для прыёму гасцей, для правядзення нашых агульных епархіяльных сходаў. Да гэтага моманту не маем такіх памяшканняў, таму даводзіцца іх арандаваць. У будучым цэнтры будзе зала для пасяджэння беларускага сінода, кабінеты сінадальных установ БПЦ, таму што сёння яны раскіданыя па прыходах і ім, на жаль, у сённяшнім будынку епархіі не хапае месца.

Па словах мітрапаліта Паўла, пакуль асноўнага спонсара ў будаўніцтва няма і ім выступае сама Царква.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

«НЯХАЙ ЗЯМЕЛЬКА СКАЖА СЛОВА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асноўная задача навукоўцаў сёння — максімальна эфектыўна дапамагчы аграрыям атрымаць як мага большы ўраджай. У навукова-практычным цэнтры па земляробстве ўжо распрацаваны рэкамендацыі па правядзенні веснавой сяўбы 2016 года і накіраваны ў Мінсельгасхарч, раённыя выканаўчыя камітэты і гаспадаркі. У гэтых рэкамендацыях ёсць усе неабходныя аперацыі, якія неабходна выконваць увесну.

Гатоўнасць — 90%

Ужо сёння гатоўнасць сельскагаспадарчай тэхнікі да веснавой пасяўной кампаніі ў Беларусі набліжаецца да поўнай. Аднак, па словах намесніка генеральнага дырэктара па ўкараненні і выпрабаваннях Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Дзмітрыя Комлача, застаюцца яшчэ некаторыя рэгіёны, дзе ёсць адставанне па гэтым найважнейшым паказчыку.

Пры гэтым навукоўцы падкрэсліваюць, што па тэхнічным забеспячэнні, з'яўленні інавацый пытанняў няма. У навукова-практычным цэнтры цяпер актыўна працуюць над стварэннем пасяўных глебаапрацоўчых агрэгатаў шырынёй захопу 9-12 м. Таксама вядзецца распрацоўка 12-корпуснага абаротнага плуга. Акрамя таго, НПЦ па механізацыі сельскай гаспадаркі актыўна супрацоўнічае з гаспадаркамі па ўкараненні сучаснай тэхнікі ў АПК.

Дзмітрый Лужынскі распавёў, што навукоўцы цэнтра за зімовы перыяд правялі сярод практычна ўсіх агранамічных спецыялістаў краіны — а гэта больш за тысячу чалавек — навучанне па сучасных тэхналогіях вырошчвання, па выкарыстанні сучасных сартоў, угнаенняў, сродкаў аховы, па магчымых метадах скарачэння сабекошту раслінаводчай прадукцыі.

Будзе засуха?

Ужо на пачатковым этапе пасяўной кампаніі 2016 года навукоўцы асцерагаюцца магчымага недахопу вільгаці ў глебе. Як расказаў намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» Вадзім Маханько, узровень грунтавых вод ужо прыкладна на 60 см ніжэйшы за норму. А ў такіх умовах будуць выйграваць тыя вытворцы, якія змаглі наладзіць паліў. Гаворка ідзе і аб вырошчванні гародніны і ягад. А, напрыклад, вытворчасць бульбы не можа сёння быць высокарэнтабельнай без якаснага арашэння. І калі летась глебавыя запасы вільгаці былі нашмат большыя, то нізкае стаянне грунтавых вод цяпер можа яшчэ больш пагоршыць магчымую засуху.

Азімыя без страт

